

ЦІ МОЖНА ЗРАЗУМЕЦЬ «ЛІЧБАВАЕ ПЛЕМЯ»? ЧЫРВОНКА

ЯК ДЗЯЎЧЫНА СТАЛА... МЕХАТРОНІКАМ ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 КРАСАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 78 (28945)


### ЛІЧБА ДНЯ

**180**

*лясных пажараў на плошчы больш за 800 гектараў адбылося ў Беларусі з пачатку года. Найбольш складаная сітуацыя назіраецца ў Брэсцкай вобласці. Па стане на 24 красавіка ў гэтым рэгіёне зарэгістраваны ўжо 81 лясны пажар на плошчы звыш 600 га. У Брэсцкай вобласці з пачатку года адбыліся тры трансгранічныя пажары. Узгаранне распаўсюдзілася на беларускія лясы з тэрыторыі Украіны. Агонь часцяком пераходзіць на лясныя насаджэнні, у выніку чаго істотна церпіць і лясны фонд, і прыродная разнастайнасць нашай краіны. У сувязі з гэтым Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае грамадзян быць асцярожнымі з агнём, не рызыкаваць сваім жыццём, здароўем, маёмасцю, не наносіць шкоду бяздумнымі дзеяннямі навакольнаму асяроддзю.*



# ГУЛЬНІ НА ФАРФОРЫ




Фота БелТА.

На Гомельшчыне права выпрабляць тавары з сімволікай II Еўрапейскіх гульняў атрымалі пяць прадпрыемстваў, сярод якіх і Добрушскі фарфоравы завод. На прэзентацыі, якая днямі прайшла ў Гомелі, былі прадстаўлены ўзоры прадукцыі, якая, несумненна, знойдзе зацікаўленых пакупнікоў падчас спартыўнага форуму.

### КОРАТКА

- **Выязныя прафсаюзныя прававыя прыёмы пройдуць 25 красавіка ў Беларусі.**
- Забарона на наведванне лясоў уведзена ў чатырох раёнах Мінскай вобласці: у Старадарожскім, Валожынскім, Мінскім і Смалявіцкім.
- **Стацыянарная сістэма фотафіксацыі парушэнняў правілаў стаянкі дзейнічае ў Мінску.**



- Кіроўца легкавіка, які заблакаваў праезд «хуткай» у Мінску, пазбаўлены правоў на тры месяцы.
- **На тэрыторыі сярэдняй школы ў Камянецкім раёне падчас рамонту каналізацыйнай сеткі ў катлаване знойдзены артылерыйскі снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Передсвяточнае

## «А на Палессі ўсё нядробна...»

### Булкі — у печ, яйкі — у цыбульнік, хрон — на тарку

**Чым далей ад сталіцы, тым большая верагоднасць захаваць тое, што пакінулі нам продкі ў першасным выглядзе. Без лоску і прыцягнутых за вушы акалічнасцяў, якія дапамагаюць зарабіць грошы на так званай аўтэнтычнасці. Аўтар «Звязды» расказвае на прыкладзе сваёй сям'і, як сучасныя палешукі рыхтуюцца да свята Уваскрэсення Хрыстовага.** СТАР. 13



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыллё

## НА СТАЛІЧНАЙ АРБІЦЕ

### Пачым нерухомасць у гарадах-спадарожніках

**За апошні год цэны на будоўлях Мінска ў залежнасці ад класа якасці выраслі ад 4 % да 10 %. У выніку аднапакаёвая кватэра класа «Эканом» у сярэднім падаражэла на 3,5 тысячы долараў, класа «Стандарт» — ужо на 5 тысяч. Для кагосьці гэта не так ужо і шмат, а для іншых — дастаткова, каб звярнуць увагу на больш даступныя па кошце кватэры ў прыгарадзе Мінска. Ці насамрэч гэта альтэрнатыва?**

### Вясковае жыццё з гарадскімі выгодамі

Возьмем, напрыклад, Бараўляны. Гэта пасёлак, у якім не спыняецца жыллёвае будаўніцтва. За апошні дзясятак гадоў невялікі населены пункт, раней вядомы як месца размяшчэння буйных медыцынскіх устаноў, ператварыўся ў элітны і развіты пасёлак. Гэта і ёсць першы па факце «памочнік» Мінска. Каб не было сумневаў, вы пацікаўцеся лічбамі прыросту насельніцтва ў Бараўлянах: за апошнія пяць гадоў — з 18 да 51 тысячы чалавек. Відавочна — у Бараўляны яшчэ едуць чаргавікі з Мінска. Атрымліваецца, што побач са сталіцай «спадарожнік» арганізаваўся сам па сабе. А яшчэ ёсць Калодзішчы, Копішча і Прылукі. Яны таксама растуць. Іх даўно ўжо трэба прызнаць Мінскам, а не рабіць выгляд, што гэта вёскі.

Прынамсі, цяпер продаж кватэр у гэтым пасёлку ў новабудоўлі прыраўноўваецца па кошце да сталічных прапаноў. І гэта вытлумачальна. Наяўнасць дзіцячых садкоў і прыватных адукацыйных устаноў, школ і гімназій стварае аптымальныя ўмовы для навучання дзяцей, а чыстае паветра, добраўпарадкаваныя і бяспечныя дзіцячыя пляцоўкі — найлепшае асяроддзе для гарманічнага развіцця і выхавання. СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

## Прэзідэнт здзейсніць рабочы візіт у Кітай

**Аляксандр Лукашэнка 25—27 красавіка прыме ўдзел у II Форуме міжнароднага супрацоўніцтва «Пояс і шлях» у Пекіне, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. На палях мерапрыемства кіраўнік дзяржавы правядзе шэраг двухбаковых сустрэч.**

Плануецца, што Прэзідэнт прадставіць прапановы Беларусі па развіцці гэтай глабальнай ініцыятывы, а таксама па паглыбленні супрацоўніцтва на еўразійскай прасторы з акцэнтам на стварэнні раўнапраўнай і празрыстай сістэмы міжнароднага гандлю.

Яшчэ запланавана сустрэча беларускага лідара са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Тэмы для абмеркавання — рэалізацыя найбольш значных сумесных праектаў, развіццё міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, перспектывы паглыблення беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння ў розных сферах. Магчымыя перагаворы і з лідарамі іншых дзяржаў.

## Пашану заслужылі

**Учора прэм'ер-міністр краіны Сяргей Румас уручыў дыпломы пераможцам конкурсу на саісканне прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці ў 2018 годзе.**

Перад узнагароджваннем Сяргей Румас адзначыў, што прэмія ўрада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці — гэта самая высокая нацыянальная ўзнагарода, якая ўручаецца найлепшым арганізацыям нашай краіны, што дасягнулі значных вынікаў у галіне якасці прадукцыі і паслуг, укаранілі сучасныя метады менеджменту і інавацыйныя тэхналогіі. Таксама ён падкрэсліў, што эканамічная палітыка дзяржавы сканцэнтравана на эфектыўнасці і якасці. А гэта знаходзіць адлюстраванне ў росце паказчыкаў, якія характарызуюць прадукцыйнасць працы, рэнтабельнасць, долю інвестыцый у асноўны капітал, удзельную вагу экспарту і імпартазамяшчэнне.

Прэм'ер-міністр краіны падзякаваў прадстаўнікам найлепшых прадпрыемстваў за сістэмнае прасоўванне якасці ва ўсіх сферах дзейнасці, уклад у паляпшэнне эканамічнай сітуацыі ў краіне. Ён лічыць, што пераможцы конкурсу сваёй эфектыўнай працай, высокай сацыяльнай адказнасцю стымулююць партнёраў да самаўдасканалення, актыўнай працы ў галіне якасці, выкарыстання перадавога вопыту і сучасных механізмаў кіравання. Усё гэта, у сваю чаргу, спрыяе стабільнаму развіццю нашай краіны, захаванню рэсурсаў і навакольнага асяроддзя.

**Лаўрэатамі конкурсу сталі дзесяць арганізацый,** якім было вырашана ўпершыню прысудзіць прэмію ўрада за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці і канкурэнтаздольнасці выпрабленай прадукцыі. Сярод іх гімназія № 1 імя Я. Карскага г. Гродна, канструктарска-тэхнічны цэнтр Беларускай чыгункі, Тураўскі малочны камбінат, 4-я гарадская клінічная бальніца імя М. Саўчанкі Мінска, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка і іншыя. Гэтыя ўстановы знаходзяць новыя магчымасці для развіцця, росту сваіх асноўных мэтавых паказчыкаў за кошт эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў, удасканалення сістэмы арганізацыі вытворчасці, аптымізацыі выдаткаў.

**Яшчэ 15 арганізацый пацвердзілі званне лаўрэата,** атрыманае раней. Сярод іх Універсітэт грамадзянскай абароны МНС, акцыянернае таварыства «Атлант», Рэчыцкі метызны завод, кампанія «Савушкін прадукт», унітарнае прадпрыемства «Граніт», швейная фабрыка «Мілавіца», сумеснае прадпрыемства «Спартак» і іншыя.

Лаўрэаты, у тым ліку тыя, хто пацвердзіў гэтае званне, на працягу трох гадоў могуць выкарыстоўваць малюнак эмблемы прэміі ў маркіроўцы тавараў і дакументацыі, а таксама ў рэкламных мэтах.

**Тры арганізацыі ўдастоены спецыяльных узнагарод.** Акцыянернае таварыства «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК» атрымала ўзнагароду ў намінацыі «лідарства», прадпрыемства «АйБіЭй АйЦі Парк» — у намінацыі «Дасканаласць менеджменту». Кампанія «Савушкін прадукт» адзначана ў намінацыі «Сацыяльная адказнасць».

«Усяго за 20 гадоў існавання прэміі ўрада ўзнагародамі было адзначана 227 арганізацый. Гэта нашы лідары па якасці з розных галін эканомікі і сферы паслуг», — падсумаваў Сяргей Румас.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Блізкая ўлада

# ЯК ШМАТДЗЕТНЫМ ЗАЙМЕЦЬ УЛАСНУЮ КВАТЭРУ

## Гэтае і іншыя пытанні цікавяць жыхароў Міншчыны



**Пятнаццаць чалавек выслухаў падчас асабістага выязнога прыёму ў Любані памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ. У тым ліку шэсць грамадзян Ігар Уладзіміравіч прыняў без папярэдняга запісу. Сярод заяўнікаў — не толькі жыхары Любаншчыны, але і іншых раёнаў: Барысаўскага, Салігорскага, Пухавіцкага, Мінскага, Дзяржынскага. Амаль палова пытанняў, а менавіта сем, датычыліся будаўніцтва і атрымання жылля.**

Салігарчане Аляксей Аляксандравіч і Барыс Рыгоравіч паскардзіліся, што не могуць засяліцца ў свае кватэры ў новым доме, які пабудаваны з прыцягненнем безнаяўных жыллёвых аблігацый. Шматпавярховік узвялі ў ліпені 2018 года, а ўведзены ў эксплуатацыю ён толькі ў снежні. Тэрміны яго ўводу неаднаразова пераносіліся, дагаворныя абавязацельствы не выконваліся. Заказчыкам выступала таварыства з абмежаванай адказнасцю «Квадрат Груп». На сённяшні дзень фірма вярнула толькі невялікую частку даўгоў генпадрадчыку — Салігорскаму домабудаўнічаму камбінату. Дом здадзены са шматлікімі недахопамі, якія неабходна ліквідаваць. Камбінат нібыта і не супраць, але ў яго дэфіцыт неабходных на гэта сродкаў, паколькі заказчык яшчэ не разлічыўся за работы. Запазычанасць — каля мільёна рублёў. Акрамя таго, уласнікі жылля падазраюць фірму ў расходаванні сродкаў інвестараў не па прызначэнні і просяць правесці праверку. «Дзеля таго каб папярэдзіць паўтарэнне такой сітуацыі з іншымі людзьмі», — заўважылі яны.

Ігар Яўсееў абяцаў узяць пытанне на кантроль і дэталёва разабрацца ў сітуацыі. Пры гэтым ён адзначыў, што грамадзяне часта звяртаюцца па пытаннях зацягвання тэрмінаў будаўніцтва жылля так званымі «фірмачкамі», скардзяцца на нездавальняючую якасць, шматлікія будаўнічыя хібы. «Прэзідэнт дакладна абазначыў: калі ў цябе ёсць свая будаўнічая арганізацыя, адпаведны штат, тэхніка, то, калі ласка, будуй. Мы выдзяляем зямельныя ўчасткі толькі тым арганізацыям, якія могуць справіцца з будаўніцтвам. У гэтым выпадку ёсць з каго спытаць. А тут домабудаўнічы камбінат не можа спагнаць з камерцыйнай арганізацыі сродкі і людзі просяць дапамогі. Будзем рэагаваць», — сказаў Ігар Яўсееў.

Маладая маці прыйшла на прыём з немаўляткам на руках. Жанчына з мужам і дваімі дзеткамі жыла ў сваіх бацькоў у сельскай мясцовасці. Пераехалі ў Любань, дзе атрымалі арэндную кватэру. У сям'і нарадзілася трэцяе дзіця. Сужэнцы хацелі б пабудаваць сваё жыллё за кошт субсідыі. Але сям'ю не прымаюць на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, паколькі на кожнага члена прыходзіцца крыху больш за пятнаццаць квадратных метраў плошчы. Жанчыне растлумачылі, што стаць у чаргу можна толькі ў тым выпадку, калі яна выселіцца з арэнднай кватэры. Ды і па заканадаўстве яе паставяць на ўлік толькі праз пяць гадоў.

Як адзначыў Ігар Яўсееў, перад пачаткам прыёму ён выязджаў на месца. «Дом цудоўны, дзе створаны ўсе ўмовы для пражывання. Але шматдзетная сям'я не можа ўзяць субсідыю для будаўніцтва свайго жылля. Гэта прававы казус. Я падрыхтую інфармацыю для кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Будзем разглядаць пытанне ў межах сваёй кампетэнцыі. Мяркую, такі выпадак у Беларусі не адзіны».

У жыхаркі аграгарадка Пухавічы быў свой дом, але яго знеслі, узамен далі кватэру. Як сцвярджае заяўніца, выкупіць яе не дазволілі. Таму яна хоча атрымаць выдзеленае памяшканне ва ўласнасць. Але цяперашняе заканадаўства такога не дазваляе. Ігар Яўсееў канстатаваў, што дзейнічае ў межах закона і нічым дапамагчы не можа.

Трое жыхароў вёскі Струпень Барысаўскага раёна паскардзіліся на работу лесапілкі, якую адкрыў некалькі гадоў таму прадпрымальнік. Маўляў, няма адпачынку ні днём, ні ноччу — шум, пыл, апілкі. Адпаведная камісія на аб'екце выявіла шматлікія парушэнні і падала іск у эканамічны суд, які абавязаў прыватніка ліквідаваць недахопы. Але ён толькі часткова выканаў прадпісанне. Заяўнікі прасілі правесці яшчэ раз праверку лесапілкі. «Я перагавару з губернатарам Мінскай вобласці, і мы разам выедзем на аб'ект. А магчыма, я сам збяру камісію. Ва ўсялякім выпадку, дасканала вывучу пытанне», — запэўніў Ігар Яўсееў.

Дарэчы, такім жа складам заяўнікі раней звярталіся да старшыні Мінаблвыканкама падчас асабістага прыёму ў Барысаве. Анатоль Ісачанка даў даручэнне адпаведным службам часова прыпыніць работу прадпрыемства да высвятлення ўсіх абставін справы. Журналіст «Звязды» па заканчэнні прыёму выязджала на месца канфлікту. Аказалася, што жыхары вёскі раздзяліліся на два лагеры: адзін супраць прадпрымальніка, іншы — за яго гарой. Маўляў, ён дроў дасць бясплатна, і дарогу расчысціць зімой ад снегу, і матэрыялы для рамонту старога моста выдзеліў. Што ні чалавек, то сваё меркаванне.

Ігар Яўсееў не толькі правёў прыём грамадзян, але і наведаў сельгасарганізацыі раёна, дзе азнаёміўся з ходам пасяўной. «У Мінскай вобласці веснавыя работы на палях ідуць у штатным рэжыме, — канстатаваў ён. — Раннія яравыя збожжавыя пасеяны, паскоранымі тэмпамі хлебаробы сеюць кукурузу, лён. Мяркую, Міншчына ў пазначаны тэрмін і годна завершыць пасяўную кампанію».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


**Информация о деятельности ОАО «Фирма «Элма», УНП 200295587, г. Брест, ул. Куйбышева, 13, по состоянию на 31.12.2018 г.**

Доля государства в уставном фонде ОАО «Фирма «Элма» – 0 %.

Количество акционеров – всего 921. В том числе: юридических лиц – 6, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0, физических лиц – 915, из них нерезидентов Республики Беларусь – 5.

Информация о дивидендах и акциях

| Наименование показателей | Единицы измерения | За 2018 год | За 2017 год |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | рублей | 0 | 0 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 5,00 | 7,41 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

| Наименование показателя | Единица измерения | За 2018 год | За 2017 год |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 2679 | 2119 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 2683 | 2269 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | -213 | 386 |
| В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | -4 | -150 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | 5 | 4 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -214 | 532 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 0 | 8 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | -213 | 378 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 397 | 610 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 762 | 92 |

Среднесписочная численность работающих – 117 человек.

Основные виды деятельности – производство прочей вязанной и трикотажной одежды – 2679 тыс. рублей (100 %). Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2018 г.: 25 марта 2019 года. Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности за период с 01.01.2018 г. по 31.12.2018 г. подготовлено 22 марта 2019 г. ИП Балабан А. В., ул. Жукова, 15А, кв. 4, г. Брест, РБ, регистрационный номер № 200689434. По мнению аудитора, бухгалтерская отчетность открытого акционерного общества «Брестская трикотажная фирма «Элма» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2019 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2018 год. Аудиторское заключение опубликовано полностью 18.04.2019 г. на сайте ЕПФР. Правила корпоративного поведения применяются. Регламент работы ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма» с реестром владельцев ценных бумаг утвержден решением очередного собрания акционеров 04.03.2010 г. Положение о порядке ведения учета аффилированных лиц Общества утверждено решением совета директоров 28.04.2014 г. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: www.elma.by

Управляющий С. В. Тарасов

Главный бухгалтер Т. С. Захарова



**Учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств» объявляет конкурс на замещение следующих должностей:**

- кафедра библиотечно-информационной деятельности, заведующий кафедрой;
- кафедра информационных технологий в культуре, заведующий кафедрой;
- кафедра хореографии, заведующий кафедрой;
- кафедра психологии и педагогики, заведующий кафедрой;
- кафедра информационных ресурсов и коммуникаций, профессор;
- кафедра информационных ресурсов и коммуникаций, старший преподаватель;
- кафедра белорусской и зарубежной филологии, доцент;
- кафедра белорусской и зарубежной филологии, преподаватель;
- кафедра физического воспитания и спорта, старший преподаватель (2);
- кафедра менеджмента социально-культурной деятельности, доцент (2);
- кафедра менеджмента социально-культурной деятельности, старший преподаватель;
- кафедра педагогики социокультурной деятельности, доцент;
- кафедра педагогики социокультурной деятельности, старший преподаватель;
- кафедра межкультурных коммуникаций, старший преподаватель;
- кафедра межкультурных коммуникаций, преподаватель;
- кафедра белорусской и мировой художественной культуры, старший преподаватель;
- кафедра информационных технологий в культуре, старший преподаватель;
- кафедра философии и методологии гуманитарных наук, доцент;
- кафедра теории музыки и музыкального образования, доцент;
- кафедра искусства эстрады, старший преподаватель (2);
- кафедра искусства эстрады, преподаватель (3);
- кафедра хорового и вокального искусства, старший преподаватель;
- кафедра хорового и вокального искусства, преподаватель;
- кафедра народно-инструментального творчества, преподаватель;
- кафедра духовой музыки, старший преподаватель (2);
- кафедра белорусского народно-песенного творчества, старший преподаватель (2);
- кафедра белорусского народно-песенного творчества, преподаватель (3);
- кафедра театрального творчества, старший преподаватель;
- кафедра театрального творчества, преподаватель;
- кафедра народного декоративно-прикладного искусства, старший преподаватель;
- кафедра народного декоративно-прикладного искусства, преподаватель;
- кафедра хореографии, преподаватель;
- кафедра русского языка как иностранного, преподаватель;
- кафедра режиссуры, доцент;
- кафедра режиссуры, старший преподаватель (2);
- кафедра режиссуры, преподаватель (3).

Наш адрес: 220007, г. Минск, ул. Рабкоровская, 17, отдел правовой и кадровой работы, каб. 6. Контактный телефон (017) 2280023.

УНП 100286677



Страховой полис по ОСГО ВТС РБ серии ВВ № 3115116 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным в связи с утерей.**

УНП 100357923

Па сезоне

# НА ВАДЗЕ НЕ МАРУДЗЬ, ПРА БЯСПЕКУ НЕ ЗАБУДЗЬ!

**Афіцыйна купальны сезон пачнецца першага мая. Каб паменшыць колькасць патанулых, Таварыства ратавання на водах штогод інфармуе пра рызыкі, заклікае да выканання правілаў паводзін на вадаёмах.**

— Чым бліжэй лета, тым больш людзей цягне да водных аб'ектаў, бо адпачынак на іх не толькі прыемны, але і карысны. Адначасова ён хавае ў сабе не толькі радасць, але і пэўную ступень небяспекі, — адзначыў **Алег БАРАЗНА, вядучы спецыяліст аддзела рэспубліканскай вадалазна-выратавальнай службы Таварыства ратавання на водах.**

Галоўнымі праблемамі з'яўляюцца плаванне на адкрытай вадзе, у непрызначаных для гэтага месцах і гібель непаўналетніх. Летась пры купанні загінула 118 чалавек, з іх — 13 непаўналетніх. Пры гэтым выратавалі яшчэ 107 ахвяр вады.

Па статыстыцы, найбольшая колькасць здарэнняў адбываецца ў гарачае надвор'е. Асноўная прычына гібелі — знаходжанне ў стане алкагольнага ап'янення: колькасць такіх выпадкаў нязменна складае 70 %. Адной з распаўсюджаных праблем з'яўляецца і купанне людзей з захворваннямі. Знаходзячыся ў вадзе, яны могуць адчуць рэзкі спазм сасудаў галаўнога мозга, пераахаладжэнне. Таксама нярэдкія выпадкі падзенняў.

Сярод патанулых аказваюцца і рыбакі — карыстальнікі маламерных суднаў. За мінулы год такіх налічваецца 11 чалавек, з іх адзін непаўналетні.

— Самае галоўнае — сачыць за сабой самім, — упэўнены Алег Баразна. — Калі людзі не выконваюць элементарныя правілы паводзін на водах, рызыка няшчаснага выпадку павялічваецца ў некалькі разоў. Як бы чалавек ні ўмеў добра плаваць, як бы добра сябе ні адчуваў, — ніхто не застрахаваны.

Калі гаварыць пра непаўналетніх, то яны дзеляцца на дзве катэгорыі: дзеці да 10 гадоў, якія ацаніць небяспеку самі не могуць, і 11—18-гадовыя, што любяць забаўляцца не зважаючы на небяспеку. Адказнасць павінна ляжаць на дарослых.

...Зараз мясцовымі ўладамі вядзецца работа па вызначэнні месцаў, дзе будзе дазволена плаваць. У мінулым сезоне іх было адкрыта 456. Ужо вядома, што сёлета гэтая колькасць паменшыцца, паколькі выканкамы пераглядаюць свае рашэнні. «Некаторыя ранейшыя месцы ў гэтым годзе закрыюць таму, што яны ўжо зараслі або не адпавядаюць сучасным нормам», — растлумачыў спецыяліст.

**Юлія АДАМОВІЧ.**

# Пенсіі будуць пераразлічаны

**З 1 мая павышаюцца пенсіі. У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны растлумачылі, наколькі.**

У выніку пераразліку памеры працоўных пенсій павялічацца ў сярэднім на 6,3 працэнта. Мяркуецца, што сярэдні памер працоўных пенсій складзе 411,5 руб. Сярэдні памер пенсіі па ўзросце — 418,4 руб.

Пры гэтым памер (працэнт) павелічэння пенсіі ў выніку пераразліку ў кожнага пенсіянера будзе залежаць ад індывідуальных параметраў яго стажу працы і велічыні заробку да звароту па пенсію, а таксама ўстаноўленых да пенсіі надбавак, павышэнняў і даплат, адзначаюць спецыялісты.

Таксама спецыялісты Мінпрацы звяртаюць увагу, што надбаўкі, павышэнні і даплаты пры гэтым пераразлічвацца не будуць. Гэтыя выплаты залежаць ад памеру бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

Нагадаем, што 23 красавіка Прэзідэнт падпісаў Указ № 156 «Аб павышэнні пенсій», які прадугледжвае пераразлік працоўных пенсій з 1 мая 2019 года.

**Святлана БУСЬКО.**

# КАРАЛЕВА СПОРТУ Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ

**Вызначаны канчатковы склад камандаў, якія будуць змагацца за ўзнагароды спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы на Еўрапейскіх гульнях у Мінску.**

Нагадаем, турнір пройдзе ў новым фармаце — «Дынамічная новая лёгкая атлетыка» (DNA). Свой удзел пацвердзілі каманды 24 краін, сярод якіх Беларусь, Балгарыя, Кіпр, Чэхія, Данія, Іспанія, Эстонія, Францыя, Германія, Грэцыя, Венгрыя, Ірландыя, Італія, Латвія, Літва, Польшча, Партугалія, Румынія, Расія (спартсмены, якія атрымалі дазвол ад Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый), Славенія, Швейцарыя, Славакія, Турцыя, Украіна. Стала вядома і агульная колькасць спартсменаў — удзельнікаў спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы — 504.

Таксама Еўрапейская лёгкаатлетычная асацыяцыя зацвердзіла змяненні ў праграму спаборніцтваў II Еўрапейскіх гульняў. Пасля таго як Генеральная асамблея Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў падтрымала ініцыятыву замяніць у ёй трэкатлон, прынята рашэнне сфарміраваць дзевяць відаў (індывідуальных і эстафет), у якіх будуць разыгрываць медалі. Акрамя таго, яшчэ адзін камплект узнагарод будзе ўручаны найлепшым зборным у камандным заліку. Такім чынам, у лёгкай атлетыцы найменшыя вызначацца ў 10 відах праграмы.

Нагадаем, фармат спаборніцтваў DNA прадугледжвае правядзенне матчаў паміж змешанымі камандамі-ўдзельніцамі, дзе ўсе зборныя будуць размеркаваны па групах, пачынаючы з кваліфікацыйнага раўнда (23 чэрвеня). У кожным матчы прадугледжаны спаборніцтвы ў наступных дзевяці відах: бег 100 м (жанчыны), бег 100 м (мужчыны), бег 100 м з бар'ерамі (жанчыны), бег 110 м з бар'ерамі (мужчыны), кіданне кап'я (жанчыны), скачкі ў даўжыню (жанчыны), скачкі ў вышыню (мужчыны), эстафетны бег 4х400 м (2 жанчыны, 2 мужчыны), змешаны эстафетны бег у выглядзе гонкі праследавання (2 жанчыны, 2 мужчыны).

Пераможцы і прызёры індывідуальных відаў і эстафет будуць вызначаны на падставе вынікаў першага спаборніцкага дня (23 чэрвеня), калі адбудуцца матчы кваліфікацыйнага раўнда. Узнагароджанне найлепшых у дзевяці відах намечана на 24 чэрвеня.

Чвэрцьфінальныя матчы адбудуцца 25 чэрвеня, паўфінальныя — 26 чэрвеня. Фінал, па выніках якога будзе ўручаны апошні, дзясяты, камплект узнагарод, — 28 чэрвеня.

Прынцып камандных спаборніцтваў і налічэння ачкоў застаўся ранейшы. Тыя спартсмены, якія акажуцца мацнейшымі ў кожным відзе праграмы, будуць зарабляць па 12 ачкоў (у залік сваёй зборнай). Другія месцы прынясуць па 10 ачкоў (і гэтак далей кожнае наступнае месца з памяншэннем на два ачкі). Найлепшая каманда вызначыцца па колькасці набраных балаў.

Такім чынам, пасля зацвярджэння праграмы лёгкаатлетычных спаборніцтваў агульная колькасць камплектаў узнагарод, якія будуць разыграны падчас II Еўрапейскіх гульняў, павялічылася да 200, а ўдзел у форуме прымуць каля чатырох тысяч атлетаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Грошы

# ПЕРАВОД У ГАТОЎКУ АБЫДЗЕЦЦА Ў КАПЕЕЧКУ

**Белінвестбанк мяняе падыходы да тарыфікацыі аперацый зняцця наяўных грашовых сродкаў па банкаўскіх плацежных картках, паведамляе сайт банка.**

Змяненні і дапаўненні ўступаюць у сілу 2 мая гэтага года. Так, максімальная сума для зняцця наяўных у банкаматах банка і партнёраў без камісіі будзе складаць 500 рублёў у суткі. Калі картка адкрыта ў доларах, еўра або расійскіх рублях, то гэта 200 долараў, 200 еўра ці 15 тысяч расійскіх рублёў. Усяго ў месяц у рамках бясплатнай сумы можна будзе зняць 1500 рублёў, 600 долараў, 600 еўра, 45 тысяч расійскіх рублёў. У выпадку перавышэння ліміту будзе спісвацца камісія — 0,5 % ад сумы, але мінімум 2 беларускія рублі, або 3 долары, або 3 еўра за кожную аперацыю па выдачы наяўных.

Акрамя таго, трымальнікі картак Белінвестбанка змогуць бясплатна тры разы на працягу месяца прагледзець баланс у прыладах самаабслугоўвання — банкаматах і інфакіёсках любых банкаў. Цяпер аналагічны падыход будзе ўжыты і ў банкаматах Белінвестбанка і банкаў-партнёраў. Тры разы на месяц — бясплатна, а за кожны наступны прагляд балансу будзе спісана 25 капеек. Новыя падыходы да тарыфікацыі аперацый зняцця наяўных па картках змены ў сувязі з развіццём сістэмы безнаяўных плацяжоў, выкарыстання сучасных плацежных механізмаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Трамп захацеў паставіць журналістаў на калені



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў, што выданне The New York Times павінна папрасіць прабачэння перад ім, аднак на гэты раз выбачэнні павінны быць больш важкімі. Ён напісаў у «Твітэры», што журналісты павінны ўстаць перад ім на калені. New York Times рэгулярна крытыкуе Трампа. Вядома, што некаторыя публікацыі выдання выклікалі ў амерыканскага лідара прыступы «вулканічнага гневу і прывялі яго ў бязмерную лютасць». У прыватнасці, такі эфект, па даных The Washington Post, на яго ў 2018 годзе аказаў артыкул аб руху супраціўлення ўнутры адміністрацыі Трампа. Прэзідэнт ЗША неаднаразова называў паведамленні The New York Times ды іншых СМІ, якія не падтрымліваюць яго, «фэйк ньюс». У лютым 2017 года ён абвясціў журналістаў ворагамі народа. Самымі хлуслівымі СМІ, акрамя The New York Times, ён лічыць CNN, ABC, CBS і NBC News.

## Пыл з Сахары накрыў Францыю



У многіх рэгіёнах Францыі пагоршылася якасць паветра, а неба набыло жаўтлявы і карычневы адценні. Віной таму стаў прынесены ветрам пыл з пустыні Сахара. У сацсетках дзеляцца фатаграфіямі незвычайнай з'явы з Блакітнага берага, з Парыжа, паўночнай паловы краіны і нават з гор на поўдні. Самая цяжкая сітуацыя складваецца на паўночным захадзе краіны — у рэгіёнах Брэтань і Нармандыя. Тут ва ўмовах антыцыклону многія раёны на працягу некалькіх дзён церпяць ад забруджвання паветра, звязанага з сельскагаспадарчай дзейнасцю і аўтамабільнымі выкідамі. А пыл з Сахары толькі пагоршыць экалагічную абстаноўку. Абвешчана папярэджанне аб тым, што забруджванне можа дасягнуць узроўню 8 па дзесяцібальнай сістэме, гэта значыць якасць паветра можа стаць дрэннай і нават вельмі дрэннай, адзначае тэлеканал LCI. Мясцовыя ўлады рэкамендуюць абмежаваць фізічныя нагрузкі, асабліва людзям, якія маюць праблемы са здароўем. А ў якасці меры засцярогі хуткасць машын на аўтатрасах была зніжана са 110 да 90 км за гадзіну. Па прагнозах метэаролагаў, 25 красавіка ўзмоцніцца вецер і пройдзе дождж, пасля чаго экалагічная сітуацыя ў Брэтані і Нармандыі палепшыцца. Як вядома, пыл з пустынь у паўночнай частцы Афрыкі рэгулярна разносіцца ветрам па ўсёй Еўропе. Наступствы пераносу з гэтага рэгіёна можна назіраць ад Брытанскіх астравоў і да Урала. З падобнымі з'явамі сутыкаюцца і ў іншых рэгіёнах свету.

## Samsung адклаў запуск смартфона са складным экранам



Паўднёвакарэйская кампанія Samsung адкладае выхад адной з самых чаканых сваіх навінак — смартфона Galaxy Fold з экранам, які складваецца папалам. Гэта адбылося неўзабаве пасля таго, як адразу некалькі аглядальнікаў, якія атрымалі гаджэты для папярэдніх тэстаў, паведамілі аб тым, што іх прылады зламаліся ў ходзе выпрабаванняў. Паведамляецца таксама пра нейкія неназваныя «рэчывы», якія былі выяўлены ўнутры адной з прылад і маглі паўплываць на яе функцыянаванне. Прадстаўнікі кампаніі заявілі, што Samsung прыпыняе пачатак продажаў гэтай мадэлі, каб дакладна прааналізаваць водгукі і правесці дадатковыя тэсты. Прэзентацыі новай мадэлі, якія павінны былі адбыцца ў Ганконгу і Шанхаі на гэтым тыдні, адкладзеныя. Старт продажаў Galaxy Fold быў запланаваны на 29 красавіка ў ЗША і на 3 мая ў Вялікабрытаніі. Цяпер кампанія не паведамляе, калі гаджэты коштам у 1980 долараў паступяць на рынак. Дату пачатку продажаў абяцаюць абвясціць у найбліжэйшыя тыдні.

Рэйтынг

# ШТО КУПЛЯЛІ І ЧЫТАЛІ

## Творы Караткевіча ў «Белкнізе» па продажах на 32-м і 34-м месцах

**Падаецца, што першы квартал не самы выразны, не самы актыўны па продажах кніг увогуле. На крайні выпадак статыстыка наступная...**

Лідарам з'яўляецца «Буквар» Н. Жукавай расійскага выдавецтва «Эксмо». Прададзены 521 асобнік. На другім месцы — вядомы з ранейшага рэйтынга кніг «Дзіцячы атлас Беларусі» (укладальнік П. Грынчанка) выдавецтва «Мастацкая літаратура»: знайшлося 188 пакупнікоў гэтай кнігі. На трэцім месцы — «Залатыя правілы народнай культуры» А. Катовіч і У. Крука выдавецтва «Адукацыя і выхаванне». Прададзена 179 экзэмпляраў. На чацвёртым месцы — «Ферма» Дж. Оруэла (176 экз.). На пятым — раман В. Марціновіча «Ноч» выдавецтва «Кнігазбор» (прададзена 144 экз.).

Якія яшчэ кнігі беларускай вытворчасці аказаліся ў спісе з 45 назваў агульнага рэйтынга продажаў у кнігарнях «Белкнігі»? «Гэта Беларусь, дзетка» («Харвест», 112 экз. — 10-е месца). Хрэстаматыя для дзяцей — «Родничок» (выдавецтва «Радиола-плюс», 77 экз. прададзена) — 30-е месца. У. Караткевіч на 32-м месцы («Дзікае паляванне караля Стаха»; выдавецтва «Попурри»; прададзена 76 экз.) і на 34-м месцы — «Чорны замак Альшанскі», таксама — «Попурри» (прададзена 73 экз.). З сучасных аўтараў увайшла ў рэйтынг (39-е месца) яшчэ і Наталля Батракова — з кнігай «Бесконечность любви, бесконечность печали» (прададзена 67 экз.).

Рэйтынг першага квартала, зразумела, не зусім паказальны яшчэ і з той прычыны, што ў лютым праходзіла традыцыйная кніжная выстаўка-кірмаш, дзе выдавецтвы працавалі непасрэдна з пакупніком. Шмат прэзентацый (асабліва прыватныя выдавецтвы) ладзяць у кнігарнях рознай формы ўласнасці. Пашыраецца ў краіне кнігагандаль праз інтэрнэт. Можна было б скласці яшчэ і асобную статыстыку рэалізацыі кніг праз продажы ў час прэзентацый у бібліятэках. У нашай жа інфармацыі — размова выключна аб продажы ў сістэме гандлю «Белкнігі»: усяго па краіне працуе болей як 100 яе крамаў.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# НА СТАЛІЧНАЙ АРБІЦЭ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Купля новай аднапакаёвай кватэры ў Бараўлянах у сярэднім абыдзецца ў 35—40 тысяч долараў, «двушкі» — у 45—50 тысяч. Далевае будаўніцтва больш прывабнае, чым набыццё гатовага жылля: цана новабудоўлі тут пачынаецца ад 900 долараў за «квадрат».

**Кіраўнік аддзела агенцтва «Твая сталіца» Наталля ЖАЛАВА** адзначае, што ў сітуацыі росту цэн і ўскладнення крэдытавання ўсё больш пакупнікоў звяртаюць увагу на прыгарадныя новабудоўлі. «Розніца ў кошце з мінскімі кватэрамі часам бывае настолькі значнай, што за цану жылля ў сталіцы можна купіць гатовыя для пражывання апартаменты ў прыгарадзе і аўтамабіль у дадатак.



На думку спадарыні Жалавай, за апошнія пяць гадоў стаўленне пакупнікоў да прыгарадных новабудоўляў вельмі змянілася. Калі раней раён ваеннага гарадка ва Уруччы выклікаў пытанні, то цяпер, дзякуючы добрым транспартным зносінам, ужо і Калодзішчы многімі ўспрымаюцца як ускраіна Мінска, а не прыгарад. А, дзякуючы развітой інфраструктуры, усё больш пакупнікоў звяртае ўвагу не толькі на Прылукі, але і на горад-спадарожнік Фаніпаль. Цяпер выбар новабудоўляў у прыгарадзе Мінска змяніўся, як калькасна, так і якасна.

Гэта ўжо не адзінкавыя дамы з вокнамі, якія выходзяць на пустку, а сучасныя і камфортныя для пражывання жылыя комплексы, дзе няма загазаванасці, затораў, праблем з паркоўкамі і перапоўненымі дзіцячымі садкамі. Дзякуючы хуткаснай аўтамагістралі дабрацца да работы ў сталіцу часам можна хутчэй, чым з аднаго канца Мінска ў іншы на грамадскім транспарце».

## Чым далей — тым танней

Асноўным фактарам, які прыцягвае пакупнікоў да прыгарадных новабудоўляў, выступае цана. У параўнанні з Мінскам розніца вельмі істотная. Наглядны прыклад — кошт аднапакаёвай кватэры плошчай 33 квадратныя метры ў цэнтры Калодзішчаў абыдзецца каля 32 тысяч долараў, а 40-метровай у Фаніпалі — каля 34 тысяч. У той час як у Мінску цэны на аднапакаёўку стартуюць ад 45 тысяч «зялёных», у адным з комплексаў Фаніпаля, 55-метровая «двушка» абыдзецца ў 45 тысяч долараў, а 70-метровая «еўратрошка» ў Калодзішчах — у крыху больш як 60 тысяч долараў.

Але асаблівую цікавасць для пакупнікоў уяўляюць кватэры з рамонтам. Менавіта на іх розніца ў цэнах «горад/прыгарад» найбольшая. Калі ў Мінску мінімальны кошт «аднапакаёўкі» з аздабленнем знаходзіцца на ўзроўні 56 тысяч долараў (плошча 45 «квадратаў»), то ў Фаніпалі яна каштуе 38 тысяч. Атрымліваецца розніца каля 18 тысяч долараў. А за розніцу ў кошце трохпакаёвых кватэр (Мінск: 78 «квадратаў» за 92 тысячы долараў супраць жылля Фаніпаля той жа плошчы за 67 тысяч долараў) у памеры 25 тысяч долараў, можна купіць не толькі новы аўтамабіль, але яшчэ і лецішча.

Яшчэ адзін горад-спадарожнік — Смалявічы. Дзякуючы будучаму эксперыментальнаму дому, гэты раённы цэнтр цяпер на слыху. Распрацаваны праект указа, паводле якога запланавана будаўніцтва спецыяльнага жылога дома для мінскіх чаргавікоў.

Знаходзіцца гэты населены пункт далей, чым згаданыя Калодзішчы і Фаніпаль, — прыкладна за 30 кіламетраў ад сталіцы. Паняцце «горад-спадарожнік» тут яшчэ не стала звыклым, хоць сёння — гэта індустрыяльны горад з высокай доляй прыватнага капіталу.

Цяпер у горадзе будуюць па долевым метадзе два дамы. Вялікі дзевяціпавярховы дом узводзіць УКБ Смалявіцкага раёна. На сёння гэта жыллё будзе самым танным у наваколлі. Квадратны метр яго будзе каштаваць каля 545 долараў. Аднапакаёвую кватэру (44 «квадраты») тут можна набыць за 24 тысячы долараў, а двухпакаёвую (62 «квадраты») — за 34 тысячы.

У цэнтры горада будуюць амаль элітнае жыллё ў сяміпавярховым доме. Цана квадратнага метра пачынаецца з 750 долараў. Цэннік аднапакаёвай кватэры (39 квадратных метраў) стартуе з 31 тысячы долараў.

## Амаль ідэальны гарадок для сталіцы

Паміж Мінскам і Заслаўем хвілін пятнаццаць язды. Гэты гарадок прынята лічыць самым акуратным і дагледжаным з усіх гарадоў-спадарожнікаў. Калі не ўлічваць бяздушныя новабудоўлі, горад сапраўды зялёны. Дарослыя дрэвы растуць як уздоўж ажыўленых вуліц, так і пасярод двароў і прыватнага сектара. Вядома, цэны тут ніжэйшыя за мінскія, аднак... У жыллёвым кааператыве «Новае Заслаўе» прапановы стартуюць ужо ад 830 долараў за квадратны метр. Яшчэ год таму было 800.

«Гэта гарадок са свежым паветрам, дзе мноства вадаёмаў і лясоў. І дзяцей не баішся адпусціць пагуляць. Гэта не голае поле, дзе можна толькі кароў пасвіць, але гэта і не Мінск. Гэта прыгарад».

Гэтыя словы, напісаныя адным з удзельнікаў інтэрнэт-форуму, можна аднесці сёння да ўсіх гарадоў-спадарожнікаў. Можа, усё ж менавіта гэта, а не цана на жыллё, вабіць людзей у іх?

**Сяргей КУРКАЧ.**


Альфа·Банк

**Закрытое акционерное общество «Альфа-Банк»**

220013, Минск, ул. Сурганова, 43–47,
тел.: (017) 217-64-63, 217-64-59, факс (017) 200-59-29
Телекс 252190 ITIB BY, SWIFT ALFA BY 2X

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС по состоянию на 01.04.2019**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2019 | 2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 49582 | 53468 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 386248 | 588556 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 21167 | 38705 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 247343 | 126174 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1529609 | 1441482 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 2736 | 3497 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 70 786 | 70 989 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 11 963 | 9 725 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 2 788 | 2 463 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 14 956 | 19 106 |
| **15** | **ИТОГО АКТИВЫ** | **11** | **2 337 178** | **2 354 165** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | |
| 18 | Средства банков | 1202 | 188 389 | 214 328 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 1 627 753 | 1 624 986 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 164 822 | 168 256 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 2 357 | 1 540 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 38 908 | 44 094 |
| **24** | **Всего обязательства** | **120** | **2 022 229** | **2 053 204** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 101 369 | 101 369 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 29 807 | 26 007 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 33 591 | 33 621 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 150 182 | 139 964 |
| **31** | **Всего собственный капитал** | **121** | **314 949** | **300 961** |
| **32** | **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | **12** | **2 337 178** | **2 354 165** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ по состоянию на 01.04.2019**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2019 | 2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 47 364 | 35 779 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 17 482 | 11 838 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 29 882 | 23 941 |
| 4 | Комиссиионные доходы | 2021 | 21 177 | 15 619 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 4 002 | 3 629 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 17 175 | 11 990 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 134 | (7) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 12 567 | 9 098 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 511 | 70 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 10 960 | 11 483 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 620 | 957 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 31 498 | 28 376 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 471 | 1 924 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 16 960 | 4 266 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 2 972 | 770 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 13988,00 | 3496 |

Председатель Правления В. С. Смоляк

Главный бухгалтер А. В. Скрипка

Дата подписания: 2 апреля 2019 г. УНП 101541947



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СТАНКОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД им. С. М. КИРОВА», г. Минск, ул. Красноармейская, д. 21 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: г. Минск, ул. Красноармейская, д. 21**

Производственная база (одним лотом) в составе: **производственный корпус с АБК** (30438,2 кв. м, 500/С-42862, составные части и принадлежности: площадка складирования отходов, площадка под склад готовой продукции, площадка под склад заготовок, площадка под склад металла с путями под козловой кран, площадка (4 шт.), дорожка (3 шт.), крыльцо (2 шт.), дорожка с бордюром 0.16, площадка под памятник, проезд с бордюром 0.16, цветник, ограждение (10 шт.), ворота (5 шт.), калитка), **здание складов** (192,6 кв. м, 500/С-46903), **склад ООМиК** (59,4 кв. м, 500/С-53656), **механический цех №12** (2658,8 кв. м, 500/С-46879, навес), **теплопункт** (722,8 кв. м, 500/С-46881), **весовая** (8,6 кв. м, 500/С-62782, навес), **проходная** (9,2 кв. м, 500/С-53657), **зеленые насаждения** (деревья 44 шт., туи 15 шт., кустарники 209 шт.), цветники 34 кв. м, газоны и напочвенные покровы 5 202 кв. м), **передаточные устройства** (линия э/снабжения цеха № 12 (инв. № 20003-2), освещение наружное 220В (инв. № 2007), канализация ливневая (к главному корпусу) (инв.№ 2024), канализация производственно-фекальная (инв.№ 2023), водопровод горячее водоснабжение, главный корпус) (инв. № 2019), водопровод к новому корпусу (инв. № 2025), трубопровод сжатого воздуха внутри главного корпуса (инв. № 4311), теплотрасса до ТК-16 (инв. № 22007), теплосеть (главный корпус) (инв. № 22008), теплотрасса с дренажной насосной станцией № 30 (инв. № 22013), связь телефонная (инв. № 2008), **оборудование** (три лифта грузовых (инв. № 19537, 19457, 1280)). Подробный перечень см. на сайте cpo.by

**Начальная цена с НДС 20 % – 19 006 272,00 бел. руб.** (снижена на 15 %)

**Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу для обслуживания зданий и сооружений производственной базы на праве временного пользования пл. **5,2336 га (**срок действия по 31.07.2020). **Ограничения** прав на земельный участок: расположен в водоохранной зоне

**Условие аукциона:** дальнейшее использование предмета аукциона должно осуществляться в соответствии с требованиями генерального плана г. Минска, утвержденного Указом Президента РБ от 23 апреля 2003 г. № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации», включающие дальнейшее использование земельного участка, на котором расположен предмет аукциона, под многофункциональную застройку по согласованию с комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома. Данные условия будут включены в договор купли-продажи.
В случае продажи имущества площади предмета аукциона будут освобождены Продавцом до декабря 2020 года

**Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Звязда» 15.03.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **13.05.2019** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **10.05.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО КОНКУРСА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ**

ОАО «КУПАЛИНКА», г. Солигорск, в 14.00 30 мая 2019 года в кабинете 517А по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 58, проводит открытый конкурс по продаже следующего имущества:

– **здание общежития,** состоящее из двух зарегистрированных изолированных помещений:

– изолированное помещение с инвентарным номером 644/D-50243, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, 34-1, площадь – 2565,6 кв. м. Площадь земельного участка с кадастровым номером 643000000001000018 составляет 0,4011га. Данное изолированное помещение здания общежития является нежилым и предназначалось для дальнейшей реконструкции в многоквартирный жилой дом, с 01.01.2012 года были отключены коммуникации. На данном этапе помещение требует неотложной реконструкции;

– изолированное помещение с инвентарным номером 644/D-50244, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, 34-2, площадь – 2778,5 кв. м. Данное помещение является жилым. Количество проживающих составляет 183 человека. Количество нанимателей – 61 человек по договору найма жилого помещения. Из них 52 нанимателя – работники ОАО «КУПАЛИНКА», г. Солигорск.

**Местонахождение имущества:** Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 34.

**Стоимость:** 2 105 420,10 белорусского рубля без НДС.

**Условия продажи:**

1. Реконструкция общежития.

2. После реконструкции сдача в аренду 55 однокомнатных квартир для работников ОАО «КУПАЛИНКА», г. Солигорск, проживающих в общежитии по адресу: г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 34, сроком на 3 года с предоставлением возможности дальнейшего выкупа, а также предоставлением преимущественного права приобретения квартир после реконструкции.

**Условия оплаты:** 10 % от стоимости в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Оставшиеся 90 % – равными долями в течение 3 месяцев со дня заключения договора купли-продажи в размере оставшейся стоимости, определенной в долларах США по официальному курсу Национального банка, установленному на дату заключения договора купли-продажи. **Проведение конкурса назначено** на 14.00 30 мая 2019 года в кабинете 517А по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 58.

Окончательный срок подачи заявок на участие в конкурсе с необходимыми предложениями за три дня до начала конкурса. Договор купли-продажи имущества с победителем конкурса должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола конкурса. Бланк заявки установленной формы, а также дополнительную информацию можно получить в в кабинете 517А по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. К.Заслонова, 58 (тел. 8 0174 331-781) УНП 600024633

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

25 КРАСАВІКА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 8 (15863)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Маладыя імёны

## ЗЕНА:
# «Ад сцэны не стамляюся!»


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Праз паўтара месяца пасля нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» ўжо, здаецца, усе атрымалі адказы наконт прадстаўніцы Беларусі — што гэта за дзяўчынка, дзе яна жыве, хто яе тата і ўсё такое. Таму мы вырашылі абысціся без банальных пытанняў і пацікавіцца ў Зінаіды Купрыяновіч (спявачка ЗЕНА) і часткова ў Аляксандра, яе бацькі і дырэктара, як 16-гадовая артыстка сумяшчае падрыхтоўку да конкурсу і вучобу ў гімназіі, у чым бачыць сакрэт поспеху і як ставіцца да канкурэнтаў. Тым больш што за гэты месяц з будучымі сапернікамі па еўравізійнай сцэне ЗЕНА сустракалася ўжо двойчы: на традыцыйнай і самай вялікай pre party ў Амстэрдаме і літаральна ўчора — у Маскве.**

— Канцэрт у Амстэрдаме — гэта было крута! — не стрымлівае эмоцый спявачка. — Я пабывала ў гэтым горадзе ўпершыню, і гэта быў класны вопыт і падарожжа, і творчага працэсу. Эмоцыі — проста супер, вельмі цёплы, нейкі ўтульны горад, і людзі вельмі прыязныя, як дэлегацыі, так і ў прынцыпе ўсе сустрэчныя. Чатыры тысячы гледачоў, артысты з 27 краін, жывы гук, шыкоўная зала, мы з усімі перазнаёміліся і завязалі цёплыя стасункі. Мне цікава было патрэніравацца ў англійскую мову, паколькі на конкурсе трэба размаўляць пастаянна і свабодна. Асабліва пасябравалі з прадстаўнікамі Ізраіля і Іспаніі. Наогул, у мяне песні амаль усіх удзельнікаў ёсць у плэй-лісце, некаторыя пераслухоўваю шматразова. У Маскве крыху іншая атмасфера, бо рускамоўныя слухачы, шмат знаёмых — але прома-вечарынка атрымалася таксама крутая!

Наогул, графік у артысткі вельмі насычаны: пасля здымак відэавізітоўкі ў Тэль-Авіве пачалася работа над кліпам, а паралельна — рэпетыцыі, заняткі з педагогам па вакале і харэографам, выступленні на розных пляцоўках. «Ці не складана сумяшчаць вучобу і падрыхтоўку да конкурсу? Нармальна, паколькі я знаходжуся на дамашнім навучанні і магу кансультавацца з выкладчыкамі дыстанцыйна, праз інтэрнэт. Дый настаўнікі падтрымліваюць, дапамагаюць засвойваць матэрыял, каб я не адставала (пасля перамогі ў нацыянальным адборы Зіна перавялася з маскоўскага кінакаледжа зноў у 36-ю мінскую гімназію, дзе вучылася раней, і мае сярэдні бал вышэйшы за 9. — **Аўт.**). А ад сцэны я наогул не стамляюся, мне ўсё гэта падабаецца: выступленні, музыка, танцы, камеры, закулісце, знаёмствы з новымі людзьмі».

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Быць адной крыві

# ЗВЫКЛЫЯ ВЫКЛЮЧНАСЦІ

## Ці можна зразумець «лічбавае племя»?



**«Маё дзіця, седзячы за камп'ютарам, адначасова кантактуе ў чаце, слухае плэер, спампоўвае музыку, пры гэтым спрабуе рабіць дамашняе заданне, а яшчэ п'е сок і жуе бутэрброд. Ну як гэта можа не раздражняць?» Знаёмая сітуацыя, праўда, як для бацькоў, так і для падлеткаў? Першыя злуюцца, а другія — пачуваюцца абсалютна камфортна ў сваім асяроддзі. «Мы, прадстаўнікі лічбавага племені, можам яшчэ больш і здольныя на большае. Нам трэба паспець многае ўбачыць, зрабіць і на многае адрэагаваць. Па дарозе ад падушкі да зубной шчоткі мы паспяваем адправіць 40 паведамленняў» — парыруюць «зэты». Гэта тыя, хто нарадзіўся пасля 2003 года...**

### ЧАМУ МЫ «ХВАРЭЕМ» БЕЗ «ЛАЙКАЎ»

Даследаванне «Пакаленне «Z» у пытаннях і адказах» было прадстаўлена падчас навуковага стэндапа, арганізаванага для навучэнцаў профільных педагагічных класаў у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце. У фокусе ўвагі старшакласнікаў апынуліся праблемы сучаснага дзіцяці, якія, на думку іх саміх, з'яўляюцца на сённяшні дзень найбольш актуальнымі. Фактычна навуковы Stand Up працягнуў серыю падзей для навучэнцаў педагагічных класаў двух папярэдніх гадоў — рэспубліканскага конкурсу «Будучыя педагогі — пра школу будучыні» і фарсайт-форуму «Будучыя педагогі — аб тэхналогіях падрыхтоўкі педагога». Вынікі сваіх даследаванняў трэба было прадставіць максімальна простай і зразумелай мовай, дасціпна і захапляльна, і ўкласціся ў шэсць-сем хвілін. Усяго для ўдзелу ў стэндапе было пададзена больш як 40 заявак, але на вочны этап трапілі толькі 15 праектаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Нечакана!

# «НЕ ЖАНОЧАЯ» СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ,

## або Як дзяўчына стала... мехатронікам

**Нягледзячы на свой 18-гадовы ўзрост, Аляксандра КУРНЕВІЧ ужо мае сур'ёзны занятак у жыцці. Яна вучыцца ў Мінскім каледжы электронікі па спецыяльнасці «Мехатроніка. Работа з тэхнікай» на трэцім курсе і, дарэчы, з'яўляецца першай дзяўчынай, якая паступіла на яе. Цікава, праўда? Аляксандра можа адрамантаваць фен або наладзіць работу механізмаў аўтамабіля, зрабіць дыягностыку паламанага халадзільніка або камп'ютара. Якія яшчэ захапленні маюцца ў Сашы, чытайце ў нашым інтэрв'ю.**

— Мама заўсёды хацела, каб я стала мастачкай або дызайнерам, таму гадавала мяне творчым дзіцем: вадзіла на розныя курсы па жывапісе, казала, што менавіта гэтая справа стане для дачкі прызваннем. Але праз некаторы час я адчула, што ўсё тое — не для мяне, — прыгадвае суразмоўніца. — У дзявятым класе на ўрок па прафарыентацыі да нас у школу прыйшлі выкладчыкі з каледжа электронікі і расказалі пра перавагі навучання ў іх. Калі пералічвалі ўсе спецыяльнасці, мяне зацікавіла толькі мехатроніка. Але быў маленькі нюанс — на ёй вучыліся адны хлопцы. Магчыма, для кагосьці з дзяўчат такі расклад прагучаў бы своеасаблівым прысудам, але толькі не для мяне. З дзяцінства падабалася бавіць вольны час з бацькам у гаражы, разбіраючы розныя электрапрыборы, таму, нядоўга думаючы, вырашыла паступаць на невядомую, але цікавую для мяне спецыяльнасць. Аднак сястра настаяла кінуць гэтыя думкі і пайсці вучыцца на архітэктара. Паддаўшыся ўгаворам, вытрымала толькі да першых экзаменаў — больш не змагла. З дрыжачымі каленкамі падала дакументы ў каледж электронікі. Вельмі пакутавала, былі думкі: «Можа гэта не для мяне?», «А што, калі не атрымаецца?».



Перажыванні Аляксандры былі дарэмныя, яна з лёгкасцю паступіла на жаданую спецыяльнасць. Але пасля ўзнікла іншая нагода для хвалявання — стасункі з групай...

— Шчыра кажучы, я была ўпэўненая, што адразу знайду агульную мову з 27 хлопцамі. Як я памылялася! Яны не ведалі, як сябе паводзіць. Жартавалі, гаварылі, што мне тут рабіць няма чаго. Выкладчыкі каледжа спачатку таксама здзіўляліся, прапаноўвалі перавесціся на іншую спецыяльнасць. Але калі зразумелі, што я стаўлюся да вучобы сумленна, падтрымалі, — гаворыць Аляксандра.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
25 04 2019 г.

# ЗВЫКЛЫЯ ВЫКЛЮЧНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**Навучэнцы сярэдняй школы гарадскога пасёлка Мір Аліна КАРАЛЬЧУК, Дар'я МІГУШ і Яна СКУРАТ** прысвяцілі сваю работу адметнасцям пакалення Z, прадстаўнікі якога ўпэўнены ва ўласнай эксклюзіўнасці. Яго яшчэ называюць пакаленнем «Я» ці пакаленнем «лайкаў». «Чаму мы любім «лайкі?» Для чаго нам пахвала? Скажам прама — для душэўнага цяпла». «Галоўны наш дэфіцыт — гэта час, і ў вас, дарагія педагогі, ёсць толькі восем секунд на тое, каб нас зацікавіць!» — канстатуюць дзяўчаты.

Каб дарослыя дасягнулі ўзаемаразумення з пакаленнем «Z», юныя даследчыцы вывелі наступныя правілы: вучыцеся прымаць нас такімі, якія мы ёсць; паважаць нашу выключнасць; здзіўляйцеся нашай мультызадачнасці; вучыцеся ў нас новаму; удзяляйце нам больш увагі; захапляйце нас цікавымі ідэямі і ўсміхайцеся разам з намі.

## У ШКОЛУ — ПА АДАБРЭННЕ

Навошта дзеці ходзяць туды і як змяняюцца іх матывы ў залежнасці ад узросту? Гэтым пытаннем задалася **вучаніца Шумілінскай раённай гімназіі-інтэрната Лізавета ТРАФІМАВА.**

«Матывацыя і якасць ведаў — прама прапарцыянальныя рэчы. Веданне законаў матывацыі — гэта ключ да вырашэння школьных праблем», — упэўнена Лізавета.

Дзяўчына вырашыла даследаваць матывы да навучання ў пяцікласнікаў і адзінаццацікласнікаў і высветліла, што на першым месцы ў вучняў пятых класаў стаіць уласны дабрабыт і прэстыжнасць (добрыя адзнакі, адабрэнне з боку бацькоў, рэпутацыя ў класе, дзецям хочацца, каб іх адказы на ўроках былі найлепшыя). На другім — змест навучальнай дзейнасці (ёсць дзеці, якія любяць вучыцца, даведвацца пра штосьці новае, ім падабаюцца нестандартныя формы правядзення ўрокаў). На трэцім месцы — абавязак і адказнасць. На чацвёртым — самавызначэнне і самаўдасканаленне. І толькі на апошнім — стаўленне да вучэбнай дзейнасці (яны любяць урокі, на якіх можна паразважаць, любяць спраўляцца са складанымі сітуацыямі на занятках, разумеюць, што вучань павінен вучыцца добра, каб паступіць у ВНУ, і веды патрэбныя ім для дастойнай будучыні).

А цяпер пра матывы адзінаццацікласнікаў. Большасць з іх ужо вызначылася з тым, што адукацыя — важная рэч, без якой нічога ў жыцці не дабіцца. «Галоўнае правіла для адзінаццацікласнікаў — вучыцца ніколі не позна. А калі позна, то трэба проста ўключыць лямпу, — жартуе Лізавета. — Ну, а калі сур'ёзна, то матывы ў 11-м класе кардынальна адрозніваюцца ад матываў пяцікласнікаў. На першай пазіцыі ў іх — самавызначэнне і самаўдасканаленне. Далей ідуць стаўленне да працэсу навучання, абавязак і адказнасць, змест вучэбнай дзейнасці і толькі на пятым — уласны дабрабыт.

«Як бачым, з узростам матывы змяняюцца і тое, што стаіць у пяцікласнікаў на першым месцы (уласны дабрабыт), у выпускным класе ўжо не мае значэння. Але да самавызначэння яшчэ трэба прыйсці», — канстатуе Лізавета.

## НАВУЧЫЦЬ І ВІЗУАЛА, І КІНЕСТЭТЫКА

«Навучы мяне лёгка» — так гучала тэма навуковага стэндапа **старшакласнікаў з віцебскай сярэдняй школы № 4. Даніла ТУМКО і Яна РАЙТАНКА** прапанавалі ўсім прысутным пагрузіцца ў асаблівасці... мадальнасці. Шчыра кажучы, няпросты тэрмін для непадрыхтаваных слухачоў, але на-кінестэтычны. Навучэнцы ў гэтых класах вылучаюцца добрай працаздольнасцю, актыўнасцю, у настаўнікаў няма праблем з дысцыплінай, толькі некаторыя навучэнцы парушаюць цішыню сваімі размовамі. На перапынках таксама пануе пераважна спакойная абстаноўка, — дзеліцца назіраннямі Даніла. — У пятых класах, дзе 41 % аўдыялаў і 25 % кінестэтыкаў, навучэнцы падчас урокаў часта атрымліваюць заўвагі з-за сваіх размоў з суседам па парце. Многія разважаюць услых. У такім калектыве дзеці вельмі добра працуюць у групах, любяць уступаць у дыскусіі і адказваць хорам на пытанні.



навучэнцы педкласаў аказаліся ў тэме. Пад мадальнасцю хаваецца пераважнае выкарыстанне аднаго з каналаў (аналізатараў) прыёму і перапрацоўкі інфармацыі. Усяго іх існуе тры віды: візуальны, аўдыяльны і кінестэтычны.

З першымі двума ўсё большменш зразумела. А хто ж такія кінестэтыкі? Гэта людзі, якія лепш успрымаюць навакольны свет з дапамогай тактыльных адчуванняў (дакрананняў), чым візуальна або аўдыяльна. У жыцці кінестэтыкі — людзі дзеяння! Замест таго, каб доўга абмяркоўваць нешта ў тэорыі, яны імкнуцца хутчэй звесці гэта на справе, пачынаюць дзейнічаць, як толькі ім даецца такая магчымасць.

Адна з ідэй дыферэнцыраванага навучання засноўваецца на асаблівасцях успрымання. Даніла і Яна сфармулявалі гіпотэзу: калі ў працэсе навучання ўлічваць і выкарыстоўваць вядучую мадальнасць, то можна павысіць якасць ведаў у навучэнцаў.

«У рэальным жыцці практычна немагчыма сустрэць «чыстага» аўдыяла, візуала і кінестэтыка», — запэўнівае Яна.

— Мы правялі даследаванне і ўстанавілі, што ў нашай школе ў навучэнцаў чацвёртых класаў пераважае візуальны канал успрымання (46 %). У 18 % вучняў вядучым з'яўляецца кінестэтычны канал, у 9 % — аўдыяльны, яшчэ ў 9 % — аўдыяльна-кінестэтычны, у астатніх — візуальна-аўдыяльна-кінестэтычны. Падчас перапынкаў стаіць шум і гам, з-за якіх некаторыя навучэнцы (а менавіта візуалы) не могуць адпачыць. З адзінаццацікласнікаў роўна палова аказаліся візуаламі, чвэрць аўдыяламі і столькі ж — кінестэтыкамі.

«Аўдыялы пастаянна парушаюць цішыню. Гучна абмяркоўваюць усё, што адбываецца вакол, імкнуцца перакрычаць адзін аднаго, дыскутуюць і спрачаюцца, — канстатуюць рабяты. — Кінестэтыкі валодаюць энергіяй пастаяннага руху, штосьці разбіраюць, збіраюць, кудысьці бягуць, раняюць прадметы, паднімаюць іх і зноў бягуць. А візуалы спакойна разглядаюць табліцы, малюнкі, схемы, чытаюць...»

Будучыя педагогі раяць цяперашнім арыентавацца на шматсэнсарную падачу інфармацыі, каб і візуалы, і аўдыялы, і кінестэтыкі маглі задзейнічаць на ўроку свой галоўны ўваходны канал атрымання інфармацыі.

Для кінестэтыкаў рацыянальна выкарыстоўваць ілюстрацыі для калажаў, дыдактычныя і ролевыя гульні, заданні накшталт «мадэльканструктар», практыкаваць наглядную дэманстрацыю дзеяння закону ці прынцыпу, праводзіць практычныя вопыты... Для аўдыялаў больш падыходзяць лекцыя, дыялог з партнёрам, прагаворванне ўслых, выкарыстанне аўдыякніг. Для візуалаў трэба рыхтаваць табліцы, малюнкі, схемы, графікі і дыяграмы, падкрэсліваць ці выдзяляць ключавыя моманты колерам, выкарыстоўваць ілюстрацыі для пацвярджэння думкі.

## «АДПАЧЫНАК» У... СЕЦІВЕ

Часта кажуць, што сучасныя дзеці неразрыўна звязаны з сацыяльнымі сеткамі, яны пагружаныя ў сябе і не прызнаюць аўтарытэтаў. «Дарослыя, вы насамрэч бачыце нас такімі?» — **навучэнцы з Ушацкай сярэдняй школы Яўген БАРОДЗІЧ, Анастасія ПУГАЧОВА, Наталля ЛАДЗІК і Аляксей МАШЧОНАК** вырашылі ў сваім даследаванні «Ох, ужо гэтыя дзеткі» разбурыць распаўсюджаныя стэрэатыпы або, наадварот, знайсці ім пацвярджэнне. А для гэтага правялі анкетаванне сярод адзінаццацікласнікаў. «Якія шляхі для самавыяўлення вы выкарыстоўваеце: учынкі ці сацыяльныя сеткі?» — запыталіся яны ў сваіх равеснікаў. Высветлілася, што большасць выпускнікоў самавыяўляюцца праз учынкі, але ўсё роўна хапае і тых, хто робіць гэта праз сацыяльныя сеткі. Самыя папулярныя інтэрнэтсуполкі ў школьнікаў «УКантакце» «Інстаграм» і «Твітэр».

На пытанне «А на што вы траціце свой вольны час?» самым папулярным адказам аказаліся... «сацыяльныя сеткі», праўда, падлеткі выбіралі і такія варыянты, як стасункі з сябрамі, прагулкі, спорт, хобі і камп'ютарныя гульні. «А хто для вас з'яўляецца аўтарытэтам?» На першае месцы навучэнцы паставілі сваіх бацькоў, на другое — настаўнікаў, а вось знакамітасці для іх прыкладам для пераймання не з'яўляюцца. «Ці разумееце вы важнасць ведаў, што атрымліваеце, для рэалізацыі вашых далейшых планаў?» Станоўчы адказ далі 97 % апытаных. І амаль аднадушнае «Так» было атрымана ў адказ на пытанне «Ці выкарыстоўваеце вы інтэрнэт для навучання і самаразвіцця?» Але, як высветлілася, толькі палова адзінаццацікласнікаў правяраюць інфармацыю ў інтэрнэце перад тым, як ёй скарыстацца. А другая палова робіць гэта толькі зрэдку...

**«Галоўнае правіла для адзінаццацікласнікаў — вучыцца ніколі не позна».**

## ПАМІЖ ДВУМА СТАГОДДЗЯМІ

А ці задумваліся вы, як гэта — жыць і выхоўваць дзяцей у свеце, дзе няма інтэрнэту, мабільнай сувязі, камп'ютараў, мікрахвалевых печак і іншых выгод цывілізацыі? **Каманда з Жамчужненскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна (Крысціна ЗДАНОВІЧ, Ангеліна ГЯРКО і Эліна ЯГОРАВА)** прапанавала ўсім здзейсніць вандроўку ў часе. Калі сучасных дзесяцікласнікаў і пяцікласнікаў раздзяляе бездань (вучні пятых класаў большую частку перапынку ў школе праводзяць у сваіх гаджэтах і размаўляюць на мове, зразумелай толькі ім), то наколькі моцна адрозніваецца выхаванне дзяцей у пачатку XX і XXI стагоддзяў?

Раней яно было цалкам сямейным, у дзецях найперш выхоўвалі сыноўні і дачынны абавязак, а таксама павагу да старэйшых. Любое непаслушэнства ці абраза прыраўноўваліся да абразы вышэйшых сіл. Ужо з шасці гадоў ім даваралі даглядаць дробных жывёл, а з дзесяці — нават карову. Дзяўчат вучылі падмятаць, чысціць і мыць лаўкі, палавікі, мяняць свечкі, лучыну, чысціць газавыя лямпы, засцілаць ложак, мыць бялізну на рацэ і шмат іншага. Таксама дзяўчаты ў дзесяць гадоў умелі перапавіць і супакоіць немаўля, што плача, шыць, вышываць ткаць ручнікі, якія пазней рабіліся іх пасагам. Хлопчыкаў рыхтавалі да цяжкай фізічнай працы. У дзесяць гадоў яны павінны былі ўмець араць, баранаваць, касіць, весці за аброць каня ці ехаць на ім. Акрамя таго ў іх выхоўвалі гасціннасць, міласэрнасць да жабракоў, павагу да сваёй і чужой працы.

У наш час з-за празмернай бацькоўскай апекі ў дзяцей зніжана здольнасць да самаабслугоўвання. Сучасныя дзеці ўсё больш імкнуцца пераймаць чужыя прыклады, яны дастаткова інфармаваныя і здольныя рабіць уласныя высновы, аднак неабмежаваны доступ да інфармацыі можа дрэнна адбіцца на іх псіхіцы. Паміж цацкамі і гаджэтамі яны выбіраюць апошнія, гэта прывяло да таго, што ім стала складана знаходзіць агульную мову з равеснікамі. Дзеці маюць свой пункт гледжання і не заўсёды пагаджаюцца з меркаваннем бацькоў. Апошнія павінны іх падтрымліваць, старацца знайсці да іх падыход, развіваць моцныя бакі ў свайго сына або дачкі.

Сёння дзесяцігадовыя дзеці павінны ўмець падмятаць, мыць посуд, загружаць і выгружаць яго з пасудамыечнай машыны, мыць і чысціць гародніну, распакоўваць сумкі з крамы, гуляць з дробнымі пародамі сабак, мяняць пасцельную бялізну, таксама гатаваць простыя стравы і дапамагаць бацькам з вячэрай. Аднак толькі ў шматдзетных сем'ях дзеці могуць даглядаць малодшых брацікаў і сясцёр.

Юныя даследчыкі сцвярджаюць, што сучаснае выхаванне — гэта цэлая стратэгія па тым, як зрабіць дзіця паспяховым, навучыць яго пераадольваць няўдачы. А залогам поспеху будзе індывідуальны падыход і ўважлівае стаўленне да дзіцяці. Усё, што мы маем, вельмі моцна адрозніваецца ад таго, што было сто гадоў таму. Але ці былі змяненні да лепшага, няхай кожны вырашае сам.

Навуковы стэндап — незвычайная па форме практыка стасункаў маладых вучоных, даследчыкаў і шырокай аўдыторыі — заваёўвае ўсё большую папулярнасць у Еўропе.

Кожнае выступленне доўжыцца абмежаваны час. Усё, што патрабуецца ад удзельнікаў, гэта прэзентаваць сваю навуковую ідэю наглядна, ярка, крэатыўна і артыстычна, данесці да слухачоў яе сутнасць. Дапускаецца выкарыстанне немудрагелістага рэквізіту: касцюмаў, дэкарацый, прадметаў побыту.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Цэнтра развіцця педагагічнай адукацыі БДПУ.**

Не вучобай адзінай

# КАЛІ З ГРАШЫМА Ў СТУДЭНТА НЕ ВЕЛЬМІ...

## І што рабіць, каб парадаваць сябе нечым?

**МНОГІЯ маладыя людзі імкнуцца патрапіць на вучобу ў сталіцу, бо Мінск у іх уяўленні — горад магчымасцяў. І канешне ж, першакурснікі, уступіўшы ў дарослае жыццё, хочуць пабываць усюды, наведаць цікавыя мясціны, мерапрыемствы, фестывалі, канцэрты любімых гуртоў... Але, на жаль, не заўсёды можна ўвасобіць у жыццё сваё «хачу» за кошт базавай 80-рублёвай стыпендыі. 30 рублёў за праязны, 30 рублёў за інтэрнат, а на астатнія, умоўна кажучы, застаецца закупіць грэчку — і ўсё, няма яе, родненькай. Мы раскажам пра некаторыя хітрыкі, якія дапамогуць зберагчы студэнцкі кашалёк для незапланаванага паходу ў модны фастфуд.**



Ганна адчула сябе візажыстам...



...а Каця пакаштавала капустачкі на Камароўцы.

### АБЕД З КАВЫ І КАТЛЕТ

Пра адну недарагую кавярню мы чулі даўно, але наведалі яе ўпершыню нядаўна. Гэты вопыт нам спадабаўся: установа здзіўляе прыемнымі цэнамі. Стандарт — 1,5 рубля. Для тых, хто прывык да вялікіх аб'ёмаў кавы, задавальненне абыдзецца ў 2,5. Гэтае месца ідэальна падыходзіць для людзей з крытычным недахопам часу: замовіў, набыў, паеў, пабег. У асартыменце ёсць торцікі, булачкі, піражкі, свежавыціснуты маркоўны сок і шмат чаго яшчэ! Прадугледжаны месцы для наведвальнікаў, чые тэлефоны вечна «зжыраюць» зарадку. Мы лічым гэта велізарным плюсам! У цэлым кавярня спадабалася, за тры рублі можна цалкам спатоліць голад. Але, на нашу думку, гэта месца не падыходзіць для доўгіх душэўных пасядзелак. Тым не менш парада такая — шукайце «сваё» месца для хуткіх і недарагіх перакусаў.

### ПА МУЗЫКУ Ў... МЕТРО

Мелодыя дапамагае не засяроджваць увагу на шэрасці дзён і праблемах, яна зараджае энергіяй і дазваляе абстрагавацца ад усяго староннягa. Калі вам нестае эстэтыкі, у нас ёсць выдатная прапанова — праект «Пешаходка». У Мінску яго запусцілі нядаўна, аднак мы ўжо актыўна падтрымліваем гэтую ідэю. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што зараз для вулічных музыкантаў адводзяцца пэўныя месцы ў пераходах метро, дзе яны могуць радаваць мінакоў сваёй творчасцю і самі адначасова развівацца. Дык вось, калі раптам вам стане сумна ці проста захочацца цікава правесці вечар, паглядзіце на карту «Пешаходкі», вазьміце ў кішэню дробязь і адпраўляйцеся на найбліжэйшую станцыю метро — там вас ужо чакаюць музыкі. Не гурт Rammstein, канешне, але таленавітая моладзь.

### МОДА СА СТАРОЙ КАМОДЫ

Эксперыменты працягваюцца! Перад намі паўстала пытанне: «Ці можна выглядаць модна і пры гэтым не патраціць шалёных грошай?» Найперш мы выправіліся ў звычайную краму, у якой цэны на адзенне былі больш-менш даступныя для чалавека з сярэднім заробкам. Там «адарваліся па поўнай» і стварылі супермодны вобраз. Яго кошт — 255 рублёў. Што ж у яго ўвайшло? Шапка (10 рублёў), світар (40 рублёў), джынсы (30 рублёў), куртка (130 рублёў), боты (45 рублёў).

Далей пачалася самая складаная частка даследавання: узнаўленне падобнага вобраза ў сэканд-хэндзе. Шчыра кажучы, прыйшлося папацець. Перагляд адзення, «дайвінг» у кучы стракатых тканін, воклічы пры знаходках патрэбнага... Урэшце, яно таго каштавала. Цана бюджэтнага вобраза склала 121 рубель. Шапка абышлася ў 6 рублёў, світар — у 16, джынсы — 24, куртка — 40, боты — у 35 рублёў. Такім чынам, «прыкід» з «сэканда» абышоўся ў два разы танней, чым у звычайнай краме! Лічым, што гэта перамога!

Хочам звярнуць увагу на яшчэ адзін плюс падобных крамаў: менавіта тут можна знайсці нешта цікавае, што вылучыць вас з натоўпу і дапаможа стварыць свой уласны стыль, у той час калі звычайныя мас-маркеты прапануюць вам «наштампаваны» тавар. Асцерагайцеся сустрэць свайго двайніка!

### ЗРАБІЦЬ МАКІЯЖ ЗАДАРМА

Важная сустрэча або спатканне ўжо праз гадзіну, а вы не паспелі нафарбавацца? Нават у такой сітуацыі мы знайшлі выдатны, а галоўнае, бюджэтны выхад. Розныя брэнды прафесійнай касметыкі прапануюць пакупнікам магчымасць «затэсціць» іх прадукцыю абсалютна задарма. Вам застаецца толькі знайсці ідэальны тон памады або ценяў, а затым нафарбавацца непасрэдна ў краме. Так-так! У іх абсталяваны спецыяльныя люстэркі з падсветкай і столікі, на якіх можна знайсці ватныя дыскі і міцэлярную ваду, калі раптам нешта пойдзе не так. Прадаўцы-кансультанты рэагуюць на падобныя ператварэнні абсалютна спакойна, нават могуць нешта падказаць і параіць. Больш за тое, не саромейся да іх звяртацца, калі раптам спатрэбіцца пэндзлік, каб «паспрабаваць» танальны крэм, хайлайтар або румяны.

Адзінае, за што нам прыйшлося пахвалявацца і пачырванець — гэта просьба зрабіць фота ў краме. Астатняе прайшло выдатна, і нават макіяж, нанесены ў некаторых выпадках пальцамі, атрымаўся шыкоўны!

### ЗА АДПАЧЫНАК — НІ КАПЕЙКІ

Аператыўна знайсці мерапрыемства з вольным уваходам дапамогуць інтэрнэт-афішы. Выстаўкі, вечарыны, канцэрты, спектаклі і многае іншае. Безумоўна, не заўсёды сярод пераліку прапанаваных мерапрыемстваў можна адшукаць нешта даспадобы, тым не менш, калі вельмі хочацца выбрацца кудысьці з сябрамі, нясумна правесці з імі вечар і не выдаткаваць пры гэтым ні капейкі, то вам, пэўна, на ўкладкі «бясплатна».

Напрыклад, вы хочаце правесці вечар у кіно. У кінатэатры «Піянер» практычна кожны тыдзень праходзяць розныя кінафэсты, у рамках якіх усе паказы абсалютна дармовыя. Тэматыка вар'іруецца ад вострасацыяльных кінастужак да мастацкіх замежных фільмаў з рускімі субцітрамі. Не спрачаемся, што такія фільмы на аматара, але адшукаць гучныя прэм'еры за бесцань, на жаль, практычна немагчыма. Аднак калі вы аматар «непапулярнага», але цікавага і вартага кіно, то той жа «Піянер» стане для вас самай сапраўднай знаходкай. І пошукі ў гэтым кірунку можна працягваць далей.

### «ЗАМАРЫЦЬ ЧАРВЯЧКА» НА РЫНКУ

Ну што, прыйшоў час заваёўваць Камароўскі рынак! Мы вырашылі ўскладніць задачу і здаволіць голад задарма! І не, мы нічога не кралі. Ёсць легальны спосаб: проста падысці да прылаўка, на якім выстаўлена прадукцыя, міла ўсміхнуцца, спытаць цану ў прадаўца, а потым папрасіць пакаштаваць. Такім чынам, «на зубок» нам трапіліся: адна вінаградзінка, адно зярнятка граната, памідорка чэры, долька мандарына і два віды кіслай капусты. Як вы здагадаліся, такім смешным наборам прадуктаў па-сапраўднаму здаволіць голад у нас не атрымалася (хіба што на некаторы час падтупіць гэта пачуццё), але пазітывам мы зарадзіліся на ўвесь дзень. Магчыма, у адносным правале такога «эксперымента» ролю адыгралі сарамлівасць і «не сезон» на багацце ягад, садавіны і агародніны, аднак паход на Камароўку ўсё яшчэ можна лічыць варыянтам незвычайнага баўлення часу з сябрам.

### КАРОТКІЯ ВЫНІКІ

Вельмі спадзяёмся, што наш гайд быў для вас карысны. Хочам вас запэўніць, што ў Мінску можна крута правесці выхадныя, апрануцца, нафарбавацца і паесці, не марнуючы на гэта касмічныя сумы. Усё залежыць толькі ад вашай вынаходлівасці, фантазіі і прагі эксперыментаў!

**Кацярына ЯРАШЭВІЧ, Ганна БАРАНОК,**
**студэнткі І курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**



Гэты вобраз быў створаны ў звычайнай краме...




...а гэты падобны — у сэканд-хэндзе.

У ліку найлепшых

# «Вясна» ідзе — «Каралеве» дарогу!

## Хто атрымае гэты тытул сёлета?

**Рэспубліканскі конкурс грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева вясна — 2019» адбудзецца заўтра ў Prime Hall у Мінску, у адным з самых сучасных і камфартабельных сталічных амфітэатраў. У творчых і інтэлектуальных спаборніцтвах папулярнага студэнцкага праекта пазмагаюцца трынаццаць прадстаўніц устаноў вышэйшай адукацыі краіны.**

Усе дзяўчаты з'яўляюцца ўдзельніцамі ўніверсітэцкіх, абласных і Мінскага гарадскога тураў конкурсу. Фінал уяўляе сабой тэатралізаванае дзеянне і складаецца з розных конкурсных заданняў, пры выкананні якіх яны прадэманструюць сцэнічную культуру, уменне падтрымліваць стасункі з аўдыторыяй, камунікабельнасць, веданне этыкету, пачуццё гумару, грацыю, інтэлектуальныя і творчыя здольнасці, артыстычнае майстэрства і свае знешнія даныя. Да кульмінацыйнага вечара для ўдзельніц рэспубліканскага фіналу прайшлі экскурсіі, фотасесіі, наведванне майстар-класаў па дэфіле, акцёрскім і аратарскім майстэрстве і многае іншае.

Тэма фінальнага прадстаўлення — «Ззянне ўнутранай прыгажосці». Па задумцы арганізатараў, цягам усяго мерапрыемства будзе раскрыты індывідуальны вобраз кожнай удзельніцы. Гэта будзе прасочвацца як у тэматычных дэфіле Totalblack, «Далікатнае», «Эпатажнае», «Рамантычнае», так і ў конкурсе аратарскага майстэрства. Тэма апошняга «Асоба пра асабістае», падчас якога дзяўчаты раскажуць пра падзею, што змяніла іх жыццё. Акрамя таго, фіналісткі праявяць артыстызм і крэатыўнасць у творчых нумарах.

Пераможцамі конкурсу стануць удзельніцы, якія паказалі найлепшыя вынікі і набралі найбольшую колькасць балаў і галасоў членаў журы. Яны будуць ушанаваны званнямі «Каралева Вясна Беларусі», «Першая Віцэ-Каралева Вясна», «Другая Віцэ-Каралева Вясна». Будуць вызначаны і пераможцы ў асобных намінацыях «Міс Абаянне», «Міс Грацыя», «Міс Творчасць», «Міс Спорт», «Міс Інтэрнэт-сімпатый» і іншых.

Дарэчы, галасаванне за тытул «Міс Інтэрнэт-сімпатый» будзе праходзіць у групе БРСМ у сацыяльных сетках ва «УКантакце» і «Інстаграм» да 26 красавіка ўключна. Пераможцы конкурсу, якія зоймуць першае і другое месцы, прадставяць Беларусь у фінале Міжнароднага міжвузаўскага конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева студэнцтва — 2019», які сёлета пройдзе ў чэрвені ў Расіі.

Ідэйным натхняльнікам і арганізатарам «Каралевы Вясны» выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Нацыянальнай школы прыгажосці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
25 04 2019 г.

*Рух ад сэрца*

# Перамагчы ў сабе стэрэатыпы

**Маленькія крокі да дабрыні — вялікая справа. Так лічыць трэцякурсніца Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Валерыя КАВАЛЕЎСКАЯ. Гэтая думка яшчэ ў школе стала для яе стымулам, каб падаца ў валанцёры Чырвонага Крыжа, а пазней — у валанцёрскую каманду Social Weekend. Нядаўна Валерыя, дзякуючы перамозе ў конкурсе, які ладзілі каардынацыйны савет па адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця Міністэрства адукацыі і яго партнёры, стала Маладзёжным паслом Мэт устойлівага развіцця (МУР).**

«Мне заўсёды хацелася дапамагаць людзям, — успамінае дзяўчына, — таму ў дзявятым класе ў роднай Лідзе я і прыйшла ў Чырвоны Крыж. Мы збіралі грошы для выхаванцаў з дзіцячых дамоў і праблемных сем'яў, развозілі навагоднія падарункі...»

Калі Лера паступіла ва ўніверсітэт, то вырашыла прадоўжыць валанцёрскую справу і пайшла ў каманду Social Weekend. Тут яна не толькі дапамагала ладзіць мерапрыемствы, але і натхнялася сама, слухаючы карысныя лекцыі: як прасоўваць свой праект, як ствараць лагатып... А таксама камунікавала з гасцямі і ўдзельнікамі кон-

**Даведка**

Мэты Устойлівага развіцця — сямнаццаць мэт Праграмы развіцця ААН, якія скіраваны на вырашэнне пэўных пытанняў: скарачэнне ўзроўню беднасці, голаду, хвароб, гендарнай няроўнасці, а таксама на барацьбу са змяненнем клімата, захаваннем экасістэм сушы і г. д.




курсаў. «Я думала: якія ў іх цудоўныя ідэі! І захацелася самой зрабіць свет крышачку лепшым», — успамінае дзяўчына.

А першай спробай стала для Валерыі арганізацыя ўласнага мерапрыемства: як пачаць будаваць кар'еру, калі ты студэнт? У якасці лектара яна запрасіла піяр-менеджара «Праца Тут.бай» Ганну Шагун. Зарэгістравалася трыццаць пяць чалавек, прыйшло дваццаць. Лера на такую аўдыторыю і не спадзявалася, таму вынікамі была задаволена. Ды і слухачы дзякавалі: інфармацыя аказалася для іх карыснай.

Пасля дзяўчына захапілася праектам «Жывая бібліятэка», дзе непадобныя на іншых людзі распавядаюць свае жыццёвыя гісторыі.

— Я размаўляла з тымі, каго абражаюць, не ўспрымаюць з-за незвычайнай знешнасці, светапогляду, — кажа Лера. — Прыйшла дадому і вельмі доўга думала. Мой свет проста перакуліўся! Тыя стэрэатыпы, што існавалі ў галаве, не тое каб зніклі, але я пачала зусім па-іншаму ставіцца да людзей. Усвядоміла: калі чалавек не такіх светапогляду і ўяўленняў пра жыццё, як ты, гэта не значыць, што ён дрэнны. А яшчэ я зразумела, што не ўсе людзі ў нас такія талерантныя, як прынята лічыць.

Так у Валерыі нарадзілася ідэя стварыць медыяпраект, які будзе разбураць вядомыя стэрэатыпы. З ім дзяўчына заняла другое месца ў конкурсе грантаў ад кампаніі «Актывіа». Мо таму яна і вырашыла не кідаць ідэю і, як толькі даведалася пра конкурс МУР, пачала расказваць пра свой праект, выбраўшы адну з сямнаццаці тэм — «Мір, правасуддзе і эфектыўныя інстытуты». І сярод 252 удзельнікаў конкурсу стала адной з пераможцаў.

— Больш за ўсё хачу, каб наша грамадства было міралюбівым, — кажа Валерыя. — Людзі не павінны жыць у страху з-за магчымай дыскрымінацыі па колеры скуры, светапоглядзе, веравызнанні... Я супраць гвалту. Відэа, якія збіраюся ствараць, дапамогуць прадэманстраваць грамадству новыя магчымасці. Маімі героямі, напрыклад, могуць стаць актывіст Аляксандр Аўдзевіч, які запусціў праект «Інклюзіўны барыста», ці Дзяніс Васілевіч з праектам «Асаблівы падыход», дзе адаптаваны водныя экстрэмальныя віды спорту для людзей з інваліднасцю...

Лера разумее: цалкам пазбавіцца ад стэрэатыпаў немагчыма. Але вельмі хоча зрабіць так, каб людзі прыхільна ўспрымалі чужое меркаванне, не ставіліся да іншых з агрэсіяй. І верыць у тое, што ў яе гэта атрымаецца.

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

*Пад перастук колаў*

## На магістралі выберуць Міс і Лідара

**Конкурс пад аднайменнай назвай упершыню пройдзе на Беларускай чыгунцы. За галоўны тытул будуць змагацца шэсць пар. Прыгожыя, энергічныя, дапытлівыя хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце да 31 года прадэманструюць свой талент, творчыя здольнасці і інтэлектуальны патэнцыял.**

Гэта прадстаўнікі самых розных чыгуначных прафесій, якія змаглі зарэкамендаваць сябе з найлепшага боку на сваім рабочым месцы, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Будзе прадстаўлена па адной пары ўдзельнікаў, якая перамагла ў адборачным туры, ад кожнага аддзялення.

Конкурс будзе праводзіцца ў пяць этапаў. Пачнецца ён з дэфіле ўдзельнікаў «Мой адрас не дом і не вуліца, мой адрас — стальная магістраль». Затым канкурсанты выканаюць канцэртны нумар з калектывам аматарскай мастацкай творчасці (этап «У творчай садружнасці»). Удзельнікам таксама трэба будзе вызначыць, які вядомы куток краіны ці помнік архітэктуры будзе паказаны на экране і расказаць пра яго (этап «Па мясцінах Беларусі»). Падчас правядзення этапу «Карнавал збірае сяброў» адбудзецца дэфіле ў карнавальных касцюмах і іх абарона. Завершыцца конкурс фотасесіяй удзельнікаў у вячэрніх уборах.

Пераможцы конкурсу стануць уладальнікамі ганаровых званняў «Міс Беларускай чыгункі» і «Лідар Беларускай чыгункі», таксама ім будуць уручаны дыпломы і памятныя прызы.

Штогадовая традыцыя выбіраць Міс і Лідара нарадзілася ў Мінскім аддзяленні БЧ сем гадоў таму. Улічваючы асаблівую папулярнасць гэтага конкурсу, сёлета было прынята рашэнне правесці яго сярод работнікаў усёй Беларускай чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «НЕ ЖАНОЧАЯ» СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Бывала, прыязджаю ў сэрвіс, а там з недаверам пытаюцца: «Дзяўчына, вы і ёсць мехатронік?» Адказваю: «Так». Але бачу па вачах, што да мяне ставяцца несур'ёзна. Калі шукала, дзе прайсці практыку, усюды адмаўлялі. Маўляў, няма месца або «Мы хацелі б на работу хлопца, прабачце». Не разумею, як тое, што я дзяўчына, можа паўплываць на якасць выкананых задач?! Калі ў мяне амаль што апусціліся рукі, з'явілася кампанія высокатэхналагічных візуальных рашэнняў Hologram. З ёй я супрацоўнічаю дагэтуль і планую туды ісці працаваць пасля заканчэння каледжа. Цікава, што калі запрасілі на сумоўе ў кампанію, я... спазнілася. Але мне далі другі шанц, і цяпер кожны дзень я даводжу сваімі вынікамі, што маё знаходжанне ў калектыве не марнае, — гаворыць Саша.

Каледж даў добрую базу для развіцця ў прафесіі. На занятках дзяўчына старалася ўвабраць у сябе як мага больш ведаў, і цяпер ёй лёгка прымяняць іх на практыцы.

— Кожны можа выявіць і развіць у сабе менавіта тыя навыкі, якія яму патрэбныя. Я хацела навучыцца — і ў мяне атрымалася! На вучобу ў мяне заўсёды ёсць час. А вось на бессэнсоўныя сустрэчы і размовы — не. Сутыкаючыся кож-



Дык што ж такое мехатроніка? Гэта па сваёй сутнасці дастаткова складаная прафесія, якая аб'ядноўвае веданне электронікі, гідраўлікі і пнеўматыкі ў абслугоўванні высокатэхналагічнага абсталявання. Такія спецыялісты сёння вострa запатрабаваныя ў машынабудаванні, радыётэхніцы, харчовай прамысловасці. З улікам паўсюднага ўкаранення ў вытворчасць мехатронных сістэм гэта прафесія патрабуе далейшага развіцця і ўдасканалення.

ны дзень з новымі задачамі, стала больш спакойна ставіцца да многіх рэчаў, цаніць сваю працу. Я адкрыты чалавек, магу без сарамлівасці звярнуцца па параду да старэйшых калег або нават незнаёмых людзей, — дзеліцца суразмоўніца.

Аляксандра расказвае, што звычайна дзень у яе пачынаецца а сёмай гадзіне раніцы, а заканчваецца апоўначы. За гэты час дзяўчына павінна папрысутнічаць на парах, адзначыць адсутных (яна яшчэ і староста групы), праверыць пошту па рабоце, прыехаць у офіс, выканаць тэрміновыя задачы, праверыць стан абсталявання, за якое яна адказвае. Саша сапраўды прыязджае дадому ноччу...

— На вучобе і рабоце бываю часцей, чым дома. Часам паспяваю паспаць толькі чатыры гадзіны за суткі. Але гэта не засмучае, мне падабаецца! Каб усё паспець, карыстаюся праграмамі для арганізацыі свайго часу, не забываю і пра розныя стыкеры, раздрукаваныя спісы задач на найбліжэйшы час. Імкнуся не спяшацца без прычыны, бо праз гэта можна дапусціць памылкі ў рабоце.

**«Не разумею, як тое, што я дзяўчына, можа паўплываць на якасць выкананых задач?!»**

— Здаецца, у цябе зусім няма вольнага часу...

— А вось і не адгадалі! Маё захапленне — конны спорт. Таксама займаюся танцамі, паспяваю глядзець серыялы і чытаць кнігі, сустракацца з сябрамі і нават пісаць вершы (пачынае зачытваць мне адзін з іх. — **Аўт.**). Я чалавек, які не любіць сядзець на адным месцы, мне хочацца развівацца ў розных кірунках. Навык у маляванні ёсць — добра, крочым далей. У арт-мастацтве набываю вопыт зараз, а далей хачу ўключыцца ў сферу эканомікі, кіравання і менеджменту. Хачу нагадаць усім: у свеце шмат магчымасцяў, проста выберыце пэўны кірунак, будзьце мэтанакіраваныя — і поспех прыйдзе да вас!

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

Свой праект

# ЁСЦЬ ІДЭЯ? ЗАХАПІ ЁЮ ІНШЫХ!

**16-гадовы вучань мінскага ліцэя № 2 Сцяпан НАВАСЕЛЬСКІ і 15-гадовы Глеб БУЛАТАЎ са сталічнай гімназіі № 12 — аўтары сацыяльнага праекта TeenKach, які скіраваны на арганізацыю цікавага і карыснага вольнага часу для падлеткаў: сумесных трэніровак, пешых квэстаў і батутных вечарын. Гэты стартап быў адзначаны летась на конкурсе Social Weekend, дзе хлопцы выйшлі ў фінал і выйгралі матэрыяльную дапамогу ад спонсара. З моманту запуску TeenKach прайшоў год. Чым цікавы праект і чаму для развіцця патрэбна трансфармацыя, чытайце ў нашым матэрыяле.**

Хлопцы пазнаёміліся на курсах у IT-школе. Атрымалі вопыт у стварэнні сайтаў, пасля чаго вырашылі зрабіць уласную праграму. Выбралі спартыўныя трэніроўкі для падлеткаў.

— Летась у маі прайшла наша першая гульня. Мы падрыхтавалі сцэнарый, знайшлі спонсараў, якія выдзелілі прызы пераможцам... але спроба аказалася няўдалай — на квэст прыйшло ўсяго тры чалавекі. Каб праект не стаяў на месцы, змянілі вектар развіцця. Цяпер ён складаецца з батутных вечарын, пешых квэстаў і інтэлектуальных гульняў, — кажа Сцяпан.

— Сутнасць пешых гульняў у тым, каб пры дапамозе спецыяльнай праграмы цікава расказаць удзельнікам квэсту гісторыю горада, пакуль яны крочаць па вуліцах. Стаць удзельнікам проста: трэба напісаць каментарый пад пэўным пастом у нашай групе «УКантакце», зарэгістравацца на сайце і чакаць спасылку на заданні. На апошняе мерапрыемства паступіла 160 заявак, у тым ліку і ад дарослых людзей, — дадае Глеб. — У нашым праекце ёсць валюта — хелсіконы. Усе, хто прыходзіць на мерапрыемствы, выконваюць заданні і аўтаматычна трапляюць у электронную табліцу «паспяховасці». Пасля хелсіконы можна абмяняць на прызавыя сертыфікаты або падарункі.

Найбольшая актыўнасць у рамках праекта цяпер — сумесныя трэніроўкі, на якія прыходзіць па 20—30 чалавек. Арганізатары супрацоўнічаюць з адной спартыўнай секцыяй і ўжо правялі сустрэчы па змешаных адзінаборствах і гандболе.

Ад хлопцаў даведваюся, што спачатку праектам TeenKach займалася больш стартапераў — пяць сяброў, але з цягам часу засталося двое. Яны лічаць, што гэта нармальная з'ява, таму што ў людзей з'яўляюцца іншыя планы. Самі яны зараз развіваюць новыя ідэі.

— Ужо ёсць першыя вынікі. Напрыклад, наш знаёмы хацеў арганізаваць мерапрыемства накшталт мазгабойні, але, каб усё атрымалася, не хапала дадатковых рук. Мы прапанавалі ажыццявіць яго задуму ў рамках нашага праекта — ужо правялі дзве сустрэчы.


Падчас адной са спартыўных трэніровак.

Важным для нас з'яўляецца і распаўсюджванне падобных актыўнасцяў у рэгіёнах. Нас запрашалі некалькі разоў туды, і мы зразумелі: для падлеткаў там створана мала чаго цікавага, таму сітуацыю трэба змяняць, — упэўнены школьнікі.

Хлопцы прызналіся, што галоўнай памылкай на пачатковым этапе рэалізацыі праекта былі завышаныя чаканні: хацелася ўсяго і адразу. Аднак праз няўдачы прыйшлі да мінімалізму: менш, але лепш.

